*Вывучаем класіку*

Таццяна ПАЛЯКОВА

# САПРАЎДНЫ ГАСПАДАР: ЦІ ЁСЦЬ ЁН У "ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ" ІВАНА МЕЛЕЖА?

## УРОК-ДЫЯЛОГ У XI КЛАСЕ

**Мэта.** Раскрыць глыбінны сэнс паняцця "гаспадар". Дапамагчы вучням убачыць у "Палескай хроніцы" сапраўднага гаспадара, фармаваць глыбокую асабістую зацікаўленасць у пошуку адказаў на праблемныя пытанні, выхоўваць любоў да працы, пачуццё павагі да селяніна, жаданне быць гаспадаром у хаце, на Зямлі; удасканальваць звязную мову.

**Абсталяванне.** Тэкст "Палескай хронікі", фрагмент інтэр'ера сялянскай хаты 1920 – 1930-х гг., тагачаснае адзенне палешукоў.

ХОД УРОКА

На папярэднім уроку вучні атрымалі заданне запісаць у літаратурным сшытку сваё разуменне слова "гаспадар". Заняткі пачынаюцца з праверкі задання: школьнікі зачытваюць свае тлумачэнні паняцця "гаспадар".

– Гаспадар – гэта вельмі беражлівы, працавіты чалавек. Ён любіць, каб ва ўсім быў парадак. Гэта чалавек, які ўмее працаваць. Ён імкнецца да таго, каб яго праца прыносіла карысць. Гаспадар заўсёды захоўвае тое, што яму належыць.

– Гаспадар – гэта чалавек, які мае сваю гаспадарку (зямлю, хату, жывёлу) і ўмее карыстацца тым, што набывае ўласнай працай. У сям'і гаспадар – той, хто зарабляе грошы, каб забяспечыць дабрабыт сям'і, дапамагае сваім бацькам. Сапраўдным гаспадаром быць вельмі і вельмі цяжка.

– Гаспадар – гэта чалавек, які адказвае за свае слова, за ўчынкі. Ён абавязкова мае якую-небудзь маёмасць, малую ці вялікую гаспадарку і даглядае яе.

– Гаспадар – гэта чалавек, які на першае месца ставіць інтарэсы сваёй сям'і і дома. У прыказцы "Мой дом – мая крэпасць" замацаваны сэнс яго жыцця. Праца для сапраўднага гаспадара не з'яўляецца цяжкім абавязкам, таму што ён ведае, дзеля чаго працуе.

– Гаспадар – гэта чалавек, які кіруе ў дзяржаве і мае вялікую ўладу. Гаспадаром можна быць і ў сям'і. Амаль што заўсёды гаспадаром з'яўляецца бацька. Сапраўдны грамадзянін і патрыёт Радзімы павінен адчуваць сябе гаспадаром сваёй Бацькаўшчыны, ён аддае ўсё сваё жыццё служэнню народа.

– Гаспадар – гэта чалавек, які займаецца гаспадаркай. Гаспадар, які кіруе дзяржавай, павінен мець маштабнае мысленне, бо мусіць клапаціцца пра ўсё, што адбываецца ў вялікай сям'і – дзяржаве.

– Гаспадар – вельмі мудры, руплівы, адказны чалавек. Такім можа быць не кожны, бо гэта – своеасаблівы талент. Добры гаспадар у хаце – гарант шчасця ўсёй сям'і, а добры гаспадар у краіне – гарант шчасця для ўсяго народу.

Пасля адказаў разглядаецца паняцце слова "гаспадар" у Тлумачальным слоўніку беларускай мовы (запіс загадзя робіцца на дошцы).

**Гаспадар: 1.** Уласнік, уладальнік каго-н., чаго-н. Гаспадар кватэры, гаспадар хаты // Прыватны наймальнік. *Гаспадар не захацеў задавальняць патрабаванні рабочых.* // Селянін, уладальнік сялянскага двара, надзелу. ◊ *Ніхто...* [Лаўрэна] *не лічыў за гаспадара, а яго хату – за гаспадарку.* (Якімовіч.)

**2.** (звычайна з азначэннем). Чалавек, які вядзе гаспадарку, займаецца гаспадарчымі справамі. Дбайны гаспадар. ◊ *Навучыліся людзі... адчуваць сябе добрымі, руплівымі гаспадарамі.* (Кулакоўскі.)

**3.** Галава сям'і, дома. ◊ *Мужчыны падалі адзін аднаму рукі, гаспадар – цвёрда і самаўпэўнена, госць – ... нясмела.* (Чорны.)

**4.** Той, хто мае ўладу над кім-н., чым-н., паўнаўладны распарадчык. Гаспадар становішча. ◊ *Кандрат Гуга быў больш-менш незалежным гаспадаром у сваім доме.* (Колас.)

**5.** Разм. Муж. *Вестка пра падзенне самаўладства ўсімі ўспрымалася як вестка пра канец вайны, пра тое, што да дзяцей вернуцца бацькі, да маці – сыны, да жонак – гаспадары.* (Лобан.)

Далей вучням прапануецца пытанне: **У якім значэнні ўжыта слова "гаспадар" у "Палескай хроніцы" Івана Мележа?**

Большасць выбірае наступныя значэнні слова:

1. Уласнік, уладальнік каго-н., чаго-н. // Селянін, уладальнік сялянскага двара, надзелу.

2. Чалавек, які вядзе гаспадарку, займаецца гаспадарчымі справамі.

3. Галава дома, сям'і.

Выбар пацвярджаецца прыкладамі з тэксту:

*"Ён, аднак, не паказаў, што заўважыў гэта, – чаму тут здзіўляцца, калі ён ужо не хлапчук які, а гаспадар..."* (4, 18).

*"І наогул, хіба добра было б яму, няхай і маладому чалавеку, але ж мужчыну і гаспадару, старша-*



***Таццяна Васілеўна Палякова*** *– аспірантка кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны. Закончыла Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Н. Крупскай (1998). Працавала ў вячэрняй школе г. Рэчыцы.*

*му ў сям'і, звязваецца з нейкай дзяўчушкай?"* (4, 23).

*"Дзед не стаў пярэчыць: Васіль у доме станавіўся як бы старэйшым па чыну, гаспадаром, забіраў уладу"* (4, 49).

*"Цыганы наперабой аглядвалі і абмацвалі каня, так жа наперабой лаялі яго... Гаспадар, вялізны, нязграбны, слухаў іх моўчкі, як бы і не чуў"* (4, 280).

*«Пралезшы цераз чародку людзей, якія таўкліся там, ён пагаварыў аб нечым з тоўстым, паголеным чалавекам, гаспадаром "сталоўкі" Ёселем...»* (4, 280).

Спрэчнае пытанне, ці ёсць гаспадар у "Палескай хроніцы", высвятляецца з дапамогай герояў "Палескай хронікі", думкі якіх агучваюць вучні. У гутарцы ўдзельнічаюць: Васіль Дзяцел, Міканор, Халімон і Яўхім Глушакі, Цімох і Куліна Чарнушкі, Нібыта-Ігнат.

**Васіль:** *"Для мяне быць гаспадаром – мець добрага каня, хату... Ды кеб шчэ зямлі, ды не абы-якой... Эх, кеб з таго кавалка, што каля цагельні дасталося. То б надзел буў!.. Мёду прадаў бы, насення купіў бы адборнага... Пабачылі б!"* (4, 49).

**Халімон Глушак:** *"Гаспадар... Ну, ето трэба, кеб зямлі хапала, ды працаваць, працаваць на ёй трэба. А то кажуць некаторыя: дрэнная зямля. Ды була б лепей, штоб... гнуліся на ёй столькі ні дня, ні ночы не бачачы"* (5, 298). [Далей па тэксце да сказа *"Не паглядзелі, што не галадранец, а гаспадар..."* (4, 302 – 303).]

**Міканор:** *"Для мяне сапраўдная гаспадарка – агульная, не аднаасобная. Каб усе былі гаспадарамі. Калгас – вось лепшая форма яе. То була б гаспадарка, не сакрэт... Я ўжо нібы ўвачавідкі бачу, як зеляне шырокім прасцягам калгаснае жыта, як каласіцца, варушыць вусамі, даспяваючы, ячмень, як радамі бяжыць да балота, да леса бульба..."* (5, 433).

Пасля разваг Міканора Васіль і Глушак не стрымліваюцца (зачапіла за жывое) і выказваюць сваю нязгоду з ім.

**Глушак:** *"Ето што ж будзе? Аддай усё і ідзі па свеце галадранцам. Адарві ад жывога... Ды без зямелькі, без гумна, без свірна свайго ты – што чарвяк! Што галадранец вашывы!"* (5, 105).

**Васіль:** *"Аддай поле, абагуль! Аддай поле – ето ўсё адно што – аддай душу! Папробуй, адарві душу!"* (5, 323).

Настаўнік прапануе паслухаць іншых куранёўцаў.

**Яўхім:** *"Ето Міканор гаспадар? Не смяшыце! Вось вы, калгаснікі, абагулілі свае гаспадаркі... Што ж... Не бойцеся, што Міканор не дасць рады! Ён спрытны, скора знайдзе збыт усяму! Вам галаву ламаць не прыйдзецца!"* (5, 138).

**Куліна Чарнушкава:** *"Ва ўсіх на вачах Міканор раскідаў уласнае гумно. Дык які ж ето гаспадар?!"* (5, 162). *"Глушакі – вось першыя гаспадары на сяле!.. Багацеі булі і будуць першыя!"* (4, 251).

**Чарнушка:** *"Вось тут Міканор казаў: калгас – ето гаспадарка! Толькі ж ...не ўсякі, грэц яго, стараецца будзе на нечай паласе ды берагчы нечага коніка! Ды і пaглядзець яшчэ трэба, які з таго Міканора гаспадар, каб правіць такой сям'ёй! У якой чорт ведае, як дайсці да ладу!"* (5, 86).

**Нібыта-Ігнат:** *"Хэ! Які з яго гаспадар? Вядома, які – ніякі!.. Гаспадар ён, скажу вам, нібыто з г... пуля! От які ён гаспадар! (...) Я праўду кажу. Ён і ў сваёй гаспадарцы не быў ніколі гаспадаром. Поля сам <...> адзін, не абрабіў. Бацько ўсё. Ці пад бацькавым наглядам"* (3, 149).

На наступным этапе ўрока дыскусійным становіцца пытанне: **Як успрымаюць Васіль і стары Глушак абагуленне сельскай гаспадаркі?** У адказах цытуюцца прыклады з тэксту:

**Глушак:** *"Круцяцца, галадранцы: самі ўлезлі ў арцель ды другіх цягнуць ледзь не сілаю. Толькі іншыя разумнейшыя, гаспадары – не хіляцца, коса глядзяць, рашылі цвёрда жыць па-свойму..."* (5, 103).

*"Я таксама не магу перайначыцца, перастаць жыць тым, чым звык жыць заўсёды, што навек уелася ў душу. Перастаць жыць заўсёдным клопатам мне як смерць"* (5, 99). *"...Вырваць свой корань з зямлі – толькі дурань вырве!"* (5, 106). *"А дабро на каго?! Чорту лысаму пад хвост?.. Ці мо Міканору Дамецікаву? За ласку ўсю яго?"* (3, 24).

**Васіль:** *"Прыдумалі: аддай усё сваё, памяняй на чужое! Аддай сваё поле, дзе кожную сцяблінку, здаецца, сагрэў бы сам! Ішоў бы ад адной да другой ды хукаў бы, каб не мерзла! Аддай чужому, якому на яго напляваць! І рабі сам немаведама на каго, немаведама на што!.. Ідзіце, як вам хочацца! А мы як-небудзь і так пражывём! Ды пабачым – хто шчэ лепей!"* (5, 323).

Далей увага скіроўваецца на наступныя пытанні: **Як у творы вырашаецца праблема зямлі? Як кожны з герояў разумее яе для сябе? Каму павінна належаць зямля?**

Вучні прыводзяць прыклады, вакол якіх наладжваецца далейшая гаворка.

**Глушак:** *"Вядома, мне, каму ж шчэ?! Колькі ёсць, уся мая зямля. У мяне яе столькі, колькі трэба... Уласць надзяляла, уласць і запісвала... Па справядлівасці далі..."* (4, 321). *"А цяпер... Што ж ето робіцца? ...Як ляжала зямля век вечны без карысці, дык ахвоты не было нікому да яе! А як узяў, абрабіў, абсеяў – дак... Зямлю ўжо набываць не смей, нават да той, што ляжыць без ужытку, пад хмызнякамі і травою, не датыкайся!"* (4, 303).

**Міканор:** *«"Зямля народная" і закон такі: лепшую зямлю калгасу!»* (5, 152).

**Васіль:** *"Ето твой такі закон. Які ты выдумаў, штоб табе выгадно було! Штоб заставіць другіх у калгас твой пайсці! Думаеш, усё табе пазволено! Зямля – мая!"* (5, 152).

На наступным этапе ўрока вучні працуюць над пытаннямі: **Колькі зямлі патрэбна героям для вядзення гаспадаркі і як трэба на ёй працаваць?**

**Васіль:** *"Мне хопіць і той, з пасагу. Толькі б не чапляліся такія, як Міканор... Кеб була мая зямля і толькі мая. А калі б яшчэ карчоўскай, дзесяціну ці хоць паўдзесяціны! Зажыў бы зусім непагано!"* (5, 395). *"Старанна, з ахвотай, з любоўю трэба працаваць. На сябе ж робіш, не на чужога... Хочаш добра жыць – працуй! Канешне, без дабра свайго – не чалавек. Канешне, гаспадарка – ето гаспадарка,*

*аснова. Е аснова – і ты е. Берагці ўсё, канешне, трэба. І каня, і хлявок, і хату, і зямлю. Нашаму брату, гаротніку, не лёгка ето нажываецца"* (5, 322).

**Міканор:** *"Зямлі, не сакрэт, трэба многа і не абы-якой. Таму землеўпарадкаванне наўперад правядзём у калгасе! Штоб адзін масіў адрэзалі! Ды лепшай! <...> Пад калгас па закону паложано – лепшую павінны!"* (5, 141).

**Глушак:** *"Зямлі ў мяне столькі, колькі трэба. Казаў ужэ... Яе мне савецкая ўласць дала, да яна яе, ету зямлю, не на тое дала, штоб... яе адбіралі! <...> Ды шмат, шмат працаваць на ёй. Усёю сям'ёй... Нікому спуску не даваць! Тады і багацце будзе".*

**Міканор:** *"А мы і не адбіраем! Мы адразаем лішняе! А ў вас, дзядзько, не сакрэт, лішак"* (4, 321).

**Глушак:** *"Лішак! Лішак! Усё – лішак! Мо і сам я ўжэ лішак! <...> А зямля – гэта зямля, не дым, не сорам – рэжучы яе, усё роўна што рэжуць сэрца..."* (4, 320).

**Міканор:** *"Мы стварылі калгас. Таму рашылі рабіць па-калякціўнаму... Разам скасіць і прыбраць кожны надзел"* (5, 94).

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, як шмат працуе Васіль, як шчыруе ў кожнай будзённай справе. Відаць, што ён працуе заўзята, з радасцю, з ахвотаю, з любасцю. Нават у юравіцкай турме яму не дае спакою неспатоленая прага да працы. Асабліва яскрава гэта выяўляецца ў сцэнах пілавання дроў, а таксама малацьбы ў рамане "Людзі на балоце". І выпісаны гэтыя сцэны дакладна, дэталёва, з веданнем спрадвечнай сялянскай справы. *"Калі Васіль да знямогі косіць або робіць грэблю – гэта не ён косіць і робіць грэблю, а я. Мне самому прыходзілася ў дзяцінстве працаваць, ды так, што ад стомы часам рукі не маглі не тое што касіць, трымаць касу. Аўтабіяграфічны і эпізод малацьбы..."*, – пісаў Іван Мележ (2, 217 – 218).

У XI класе ад вучняў патрабуецца ўменне глыбока аналізаваць твор, абапірацца на ўважлівае прачытанне тэксту, таму мы прапануем інсцэнаваць урывак, каб засяродзіць увагу на асноўных, найбольш значных момантах. Пажадана выбраць найбольш яскравы ўрывак, напрыклад, той эпізод, калі Міканор прыходзіць да Васіля, каб агітаваць суседа ў калгас. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на аргументы, якія прыводзіць Міканор, і на пазіцыю Васіля. Візіт пачынаецца з ветлівага суседскага прывітання Міканора, яго шчырага імкнення пераканаць Васіля ў перавазе новай формы гаспадарання (гл. раман "Подых навальніцы", ч. II, раздзел 5, гл. 3 ад слоў *"увайшоў сусед Міканор..."* да слоў *"Возьмемся скора! Так возьмемся, што – пачуеш! Прывыклі, што цацкаюцца з вамі!.."*; с. 306 – 308).

У заключэнні настаўнік адзначае, што кожны з герояў мае сваё ўяўленне пра тое, якім павінен быць сапраўдны гаспадар. Для старога Глушака гэта ўладальнік вялікай заможнай гаспадаркі, добрага зямельнага надзелу. Прычым, чым большы гэты надзел, тым лепш. І працаваць на ім трэба да сёмага поту, выжыльваючыся. Для Васіля быць гаспадаром – мець уласную зямлю, каня, хату і шчыра, руплiва працаваць, каб найперш забяспечыць усім неабходным сваю сям'ю і не мець нястачы. Галоўнае – каб усё (зямля, конь, хата і г. д.) было <u>тваім</u>. Для Міканора найлепшая форма гаспадаркі – калгас, у якім кожны будзе гаспадаром, але большасць куранёўцаў разумеюць слова "гаспадар" у традыцыйным сэнсе. Ім цяжка дзяліць гаспадарку, аддаваць яе каму-небудзь, абагульваць нажытае нялёгкай працай.

Зямля для куранёўцаў – аснова іх адвечнага быцця, іх карміцелька, найпершая надзея, выток радасці і шчасця, хоць часам яна была і прычынай іх гаротнага жыцця, хваробаў, бедаў.

Для таго, каб калгас стаў сапраўднай гаспадаркай, кожны павінен быць у ім <u>гаспадаром</u>, ставіцца да агульнага, калгаснага як да свайго крэўнага. *"Камунія – гэта добра, але і ў камуніі рабіць трэба. Зямля чалавекам дзержыцца, адступіўся чалавек – і ўсё на закат пайшло"* (1, 200). Кожны селянін павінен усвядоміць, што толькі тады пойдуць справы ў калгасе, калі ў яго будзе балець сэрца за зробленае.

Урок-дыялог выяўляе веданне вучнямі зместу твора, уменне аналізаваць тэкст, пацвярджаць тэарэтычныя высновы, пададзеныя ў форме пытанняў, канкрэтным ілюстрацыйным матэрыялам, дэманструе асабістую зацікаўленасць старшакласнікаў зместам канкрэтнага мастацкага палатна, жаданне працаваць над ім і далей.

**Літаратура**

1. **Кудравец А.** Сачыненне на вольную тэму. – Мінск, 1985.
2. **Мележ І.** Жыццёвыя клопаты. – Мінск, 1975.
3. **Мележ І.** Завеі, снежань. – Мінск, 1992.
4. **Мележ І.** Людзі на балоце. – Мінск, 1991.
5. **Мележ І.** Подых навальніцы. – Мінск, 1991.